**Т. І. КАЧКАН,**
настаўніца дзяржаўнай установы адукацыі «Навучальна-педагагічны комплекс Падольскі дзіцячы сад — сярэдняя школа» Астравецкага раёна

*Да 135-годдзя з дня нараджэння*

# ЯКУБ КОЛАС. Жыццёвы і творчы шлях. Лірыка

## (урок у IX класе)

Мэта: стварыць умовы для ўзнаўлення і пашырэння ведаў пра асноўныя этапы жыцця і творчасці Якуба Коласа, асэнсаваць з вучнямі ідэйна-духоўны і праблемны змест яго лірычных твораў.

Задачы: разгледзець умовы фарміравання таленту паэта; на прыкладзе асобных вершаў раскрыць талент Якуба Коласа-пейзажыста, звярнуць увагу на элегічнае і жыццесцвярджальнае ў яго лірыцы; прааналізаваць творы «Родныя вобразы», «Беларусам», «Не бядуй!»; садзейнічаць развіццю навыкаў выразнага чытання, выпрацоўцы ўменняў вылучаць галоўнае, суадносіць біяграфію, час, у які жыў паэт, і яго творчасць; выхоўваць пачуццё любові да роднага слова, павагі да творчай спадчыны класіка нацыянальнай літаратуры.

**Тып урока:** вывучэнне новага матэрыялу.

**Тэхналогія:** элементы тэхналогіі крытычнага мыслення, прадуктыўнага навучання.

**Абсталяванне:** мультымедыйная прэзентацыя, рабочая папка вучня (карткі з заданнямі для працы ў парах, тэксты твораў), сігнальныя карткі, гульня «Правільна — няправільна».

**Эпіграф:** Мой запавет вам: ідзіце ў нагу з жыццём, не адставайце, апераджайце яго *(Якуб Колас)*.

## Ход урока

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Матывацыйны этап.**

Настаўнік. Давайце пачнём урок з запавету класіка нашай літаратуры, народнага паэта Беларусі Якуба Коласа вам, моладзі, каму належыць будучыня нашай краіны *(вучань агучвае запавет, запісаны на дошцы)*.

Што меў на ўвазе класік? Давайце паразважаем. *(Выказванні вучняў.)*

Безумоўна, Якуб Колас марыў, каб вы займалі актыўную грамадзянскую пазіцыю, імкнуліся быць карыснымі сваёй Айчыне, свайму народу. І, што вельмі важна, каб былі адукаванымі.

**III. Паведамленне тэмы і вызначэнне задач урока.**

Настаўнік. Тэма нашага ўрока — «Якуб Колас. Жыццёвы і творчы шлях. Лірыка». Прапаную вызначыць асноўныя яго задачы. Сёння на ўроку нам трэба... *(прымацоўвае наступныя словы на дошку магнітамі, вучні дапісваюць сказы)*.

Узгадаць...
Пазнаёміцца...
Прааналізаваць...

**IV. Актуалізацыя ведаў.**

Настаўнік. Знаёмства з асобай Якуба Коласа і яго творчасцю ў вас адбылося яшчэ ў пачатковай школе. Вы прачыталі шэраг твораў паэта ці ўрыўкаў з іх. Згадаем гэтыя творы.

1) Ніхто з дамашніх не згадае,
Чым рэчка Костуся займае,
Якая іх звязала сіла
І чым яна так хлопцу міла?

*(«Новая зямля», раздзел «На рэчцы».)*

2) Між алешын, кустоў,
Дзе пяе салавей,
І шуміць, і звініць
Срэбразвонны ручэй. *(«Ручэй».)*

3) А сам дарэктар, з вузел ростам,
Ў сваім уборы, бедным, простым,
У зрэбных портках кашулі,
Стаяў, як бы яго прыгнулі.

*(«Новая зямля», раздзел «Дарэктар».)*

4) Які ты, хлопец, нецярпячка,
Няхай цябе затопча качка.
...............................
— Ну, дзядзька, як на смак, прызнайся?
— Паскудства, брат, і не пытайся!

*(«Новая зямля», раздзел «Дзядзька-кухар».)*

Настаўнік. Вашай увазе прапануецца схема, кожны каласок якой — гэта частка біяграфіі паэта. Што вы ведаеце пра сям'ю, дзяцінства Якуба Коласа? Калі ёсць веды — падымайце зялёную картку; штосьці ведаеце, але не так шмат, як хацелася б — абедзве карткі; не можаце ўспомніць — чырвоную картку.

**Апорная схема**




*Вучні агучваюць вядомае.*
*Прагляд прэзентацыі.*

Настаўнік. Давайце зноў звернемся да схемы і дапоўнім яе тым новым, пра што вы даведаліся. *(Пасля прагляду мультымедыя-прэзентацыі вучні зноў звяртаюцца да схемы і дапаўняюць невядомае.)*

А цяпер адкажыце, ці справіліся мы з якой-небудзь з задач, якія ставілі перад сабой у пачатку ўрока? *(Вучні аналізуюць выкананне задач.)*

**V. Вывучэнне лірыкі Якуба Коласа.**

Настаўнік. Прапаную паслухаць верш, напісаны паэтам у час турэмнага зняволення ў мінскім астрозе. Трапіў ён за краты ў 1908 г., яго пакаралі за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе. *(Настаўнік чытае на памяць верш «Родныя вобразы».)*

У вашых рабочых папках маецца тэкст верша. Давайце прааналізуем яго.

**1.** Аналіз верша па пытаннях.

1) Да якога віду лірыкі паводле тэматычнай накіраванасці адносіцца гэты верш: пейзажнай, грамадзянскай, філасофскай, інтымнай? Чаму? *(Верш пейзажны, бо на першым плане вобразы прыроды — «узгорачкі роднага поля, рэчкі, курганы, лясы». Але прасочваюцца ў творы і грамадзянскія матывы: успаміны лірычнага героя пра «вобразы мілыя роднага краю» азмрочаны зняволеннем у астрозе, усведамленнем нялёгкай долі роднага краю.)*

2) Якім настроем прасякнуты верш? Чаму? *(Верш прасякнуты тужлівым, шчымлівым настроем, бо паэт пісаў яго ў няволі. Пра гэта сведчаць радкі «смутак і радасць мая», «поўныя смутку і жальбы нядолі», «поўныя сумнай красы».)*

3) Ці можам мы назваць верш «Родныя вобразы» элегіяй? *(Элегія — лірычны верш, прасякнуты сумным настроем. Таму «Родныя вобразы» з'яўляюцца элегіяй.)*

4) Пры дапамозе якіх мастацкіх сродкаў ствараецца вобраз роднага краю? *(З дапамогай эпітэтаў: «сумнай красы», «спелае нівы», «шум-гуд шчаслівы», «мілай красой», «песні пакутныя»; метафар: «гоман спелае нівы», «песня магутных дубоў».)*

5) Які вобраз па сваім сэнсе ўспрымаецца кантрасным? Якую ролю ён адыгрывае? *(Кантрасным успрымаецца выраз «сумная краса», бо прыгажосць найперш абуджае радасныя пачуцці. Але менавіта гэты вобраз дапамагае адчуць тужлівы стан лірычнага героя, перадае яго настрой.)*

Фізкультхвілінка.

**2.** Праца ў парах (па варыянтах).

**Варыянт І**

1) Азнаёмцеся са змешчаным ніжэй тэкстам.

**Гістарычныя ўмовы развіцця літаратуры пачатку ХХ стагоддзя**

Пачатак ХХ стагоддзя знамянальны для гісторыі і культуры Беларусі многімі падзеямі. Рэвалюцыя 1905—1907 гг. ускалыхнула вялікія грамадскія сілы, абудзіла да актыўнага грамадскага жыцця ўсе народы царскай Расіі. 1905 год стаў пераломным у гістарычным лёсе беларусаў, якія ўпершыню за апошнія стагоддзі атрымалі рэальную магчымасць сцвярджаць свае права «людзьмі звацца».

Рост народнай самасвядомасці суправаджаўся ўздымам нацыянальнай культуры. Гэты перыяд у гісторыі культуры Беларусі называюць нацыянальным Адраджэннем.

У выніку дэмакратычных заваёў рэвалюцыі 1905 года была знята афіцыйная забарона з беларускага друку. Надзвычайнай была роля ў працэсе нацыянальнага Адраджэння газет «Наша доля» і «Наша ніва». З усіх куткоў Беларусі ішлі ў «Нашу ніву» карэспандэнцыі, пісаныя спрадвечнай сялянскай крыўдай і абуджаныя верай у сацыяльна-палітычнае і духоўнае разнявольванне народа. Тагачасныя ўлады забаранялі выпісваць «Нашу ніву» настаўнікам, навучэнцам, вайскоўцам, але, нягледзячы на розныя перашкоды, беларускае слова даходзіла да чытача.

Беларуская літаратура пачатку ХХ стагоддзя адкрывала свету беларускі народ, увасабляла яго прагу палітычнай і сацыяльнай незалежнасці, нацыянальнага самавызначэння. Гэтыя ідэі вызначылі пафас творчасці ўсіх беларускіх пісьменнікаў таго часу. Ідэі нацыянальнага адраджэння адлюстраваліся і ў мастацкіх вобразах і матывах паэзіі Якуба Коласа *(Л. К. Тарасюк).*

**2.** Падрыхтуйце выступленне паводле зместу артыкула ў форме інтэрв'ю з гісторыкам літаратуры:

- Чым знамянальны пачатак ХХ стагоддзя для гісторыі і культуры Беларусі?
- Як называюць гэты перыяд у гісторыі культуры Беларусі?
- Як заваёвы рэвалюцыі 1905 года спрыялі развіццю беларускай літаратуры?
- Якімі ідэямі была прасякнута тагачасная беларуская літаратура?

**Варыянт ІІ**

1) Падрыхтуйце выразнае чытанне верша Якуба Коласа «Беларусам».

2) Закончыце думку: «У вершы "Беларусам" Якуб Колас выказвае надзею на...» *(... актывізацыю духоўных, творчых сіл народа, адраджэнне роднага краю).*

**Варыянт ІІІ**

1) Уважліва прачытайце верш Якуба Коласа «Беларусам».

2) Зрабіце аналіз верша па наступнай памятцы.

А) Жанр твора. *(Верш-заклік.)*

Б) Тэматычная накіраванасць. *(Верш адносіцца да грамадзянскай лірыкі, бо лірычны герой заклапочаны разнявольваннем духоўных, інтэлектуальных сіл чалавека.)*

В) Тэма і ідэя верша, суаднесенасць зместу з часам напісання. *(Гэты верш — своеасаблівы зварот паэта да грамадзянскай свядомасці беларусаў. У творы лірычны герой пераконвае суайчыннікаў у іх сіле і моцы, нагадвае пра ранейшае слаўнае мінулае, заклікае да сумеснай працы, якая абавязкова дасць плён. Верш напісаны ў 1906 г., пасля рэвалюцыі 1905 г., у перыяд нацыянальнага адраджэння.)*

Г) Сродкі выразнасці, іх роля. *(Метафары: «ужо глядзіць к нам на палаткі жыцця новага вясна»; параўнанне: «станем, як сцяна»; звароты: «Ўстаньце, хлопцы, ўстаньце, браткі!»; рытарычныя пытанні: «Ці ж мы, хлопцы, рук не маем?»; перыфраза: «жыцця новага вясна». Мастацкія сродкі надаюць вершу эмацыянальнасць, вобразнасць і ёмістасць думкі.)*

**Варыянт IV**

1) Падрыхтуйце выразнае чытанне верша Якуба Коласа «Не бядуй!».

2) Закончыце думку: «У вершы "Не бядуй!" паэт выказвае веру ў...» *(...народ, яго светлую будучыню)*.

**Варыянт V**

1) Уважліва прачытайце верш Якуба Коласа «Не бядуй!».

2) Прааналізуйце верш паводле наступных пытанняў.

А) Як раскрываецца ў вершы пазіцыя аўтара? *(Паэт верыць, што надыход вясны непазбежны, як і непазбежны надыход лепшай будучыні.)*

Б) Да каго звяртаецца паэт у вершы? *(Паэт звяртаецца да суайчынніка з заклікам верыць і спадзявацца, што «не загіне край твой родны ў тэй цемені начэй!».)*

В) Што сімвалізуюць вобразы восені, холаду і цемені, вясны і сонца? *(Восень, холад і цемень — сімвал беспрасветнасці існавання народа, а вясна і сонца — надзея на лепшую будучыню, адраджэнне роднага краю.)*

Г) Якія радкі гучаць жыццесцвярджальным акордам, сімвалам веры паэта ў светлую долю Беларусі?

*(Дымам пойдзе ўсё ліхое,*
*Усё, што душыць нас і гне.*
*Вер, брат, — жыцце залатое*
*Будзе ў нашай старане.)*

**3.** Прадстаўленне вучнямі вынікаў сваёй працы.

**VI. Праверка засваення ведаў.**

Гульня «Правільна — няправільна».

Н а с т а ў н і к. Прапаную вашай увазе пэўныя сцверджанні. Калі інфармацыя не выклікае пярэчанняў — падымайце зялёную картку, а калі недакладная, памылковая — чырвоную картку, пры гэтым трэба даць правільны адказ.

1. Сапраўднае імя Якуба Коласа — Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. *(Так.)*

2. Скончыўшы Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, Якуб Колас атрымаў прафесію інжынера. *(Не, настаўніка.)*

3. Першы верш паэта «Наш родны край» быў надрукаваны ў газеце «Наша ніва» ў 1906 годзе. *(Не, у «Нашай долі».)*

4. Першы зборнік песняра «Песні-жальбы» пабачыў свет у 1910 годзе. *(Так.)*

5. Якубу Коласу належаць вершы «Родныя вобразы», «Беларусам», «Не бядуй!», паэма «Бандароўна». *(Не, паэму «Бандароўна» напісаў Янка Купала.)*

6. Радкі *«Дымам пойдзе ўсё ліхое, // Усё, што душыць нас і гне. // Вер, брат, — жыцце залатое // Будзе ў нашай старане»* з верша «Родныя вобразы». *(Не, з верша «Не бядуй!».)*

7. Вершы Якуба Коласа, з якімі мы пазнаёміліся на ўроку, напісаны на пачатку XX стагоддзя, у іх выявілася вера нашага народа ў адраджэнне духоўных сіл, імкненне да лепшай будучыні, шчасця і волі. *(Так.)*

**VII. Рэфлексія.**

1) Давайце нагадаем, якія задачы мы ставілі перад сабой у пачатку ўрока і ці ўдалося нам іх дасягнуць. *(Адказы вучняў.)*

2) Ці спатрэбяцца вам у далейшым веды, набытыя сёння на ўроку? Калі так, то чаму? *(Адказы вучняў.)*

**VIII. Дамашняе заданне.**

1. Вывучыць верш «Родныя вобразы» на памяць.

2. Напісаць міні-сачыненне «Вобразы мілыя роднага краю...» або праілюстраваць верш «Родныя вобразы» (па жаданні).

**IX. Падвядзенне вынікаў, выстаўленне адзнак.**

Н а с т а ў н і к. Мне застаецца толькі падзякаваць вам за працу і пажадаць, каб вы прытрымліваліся ў жыцці запавету вялікага песняра.